якi лiчыў, што архетыпы ўзнiкаюць з калектыўнага неўсвядомленага i з'яўляюцца асноўным зместам рэлiгii, мiфалогii, легенд, ляжаць у аснове сiмволiкi творчасцi, рытуалаў, казак, мiфаў, сноў [1].

Парэмii (гэты тэрмiн апошнiм часам замяняе два традыцыйныя тэрмiны – прыказкi i прымаўкi) карыстаюцца вялiкай папулярнасцю ў народа, а ў навуковых колах фiлолагаў, лiнгвакультуролагаў яны карыстаюцца асаблiвай увагай з прычыны выяўляення ў iх вытокаў нацыянальнай карцiны свету, адлюстоўвання жыццёвага вопыту кожнага народа, яго мудрасцi, псiхалогii, маральных iдэалаў.

Сярод розных тэматычных груп парэмiй асобную групу складаюць парэмii з агульным значэннем ‘жыццё' i ‘смерць' у iх апазiцыi. Архетыповыя паняццi ‘жыццё' i ‘смерць' выступаюць як антонiмы, супрацьпастаўленнi, цесна звязаныя памiж сабой. У прыватнасцi, жыццё чалавека пачынаецца з нараджэння, а заканчваецца смерцю (*Смерць i радзiны не выбiраюць гадзiны; Круцi не круцi, а трэба памерцi; Ад смерцi не адкупiшся*). I парэмii добра выяўляюць гэтую сувязь i апазiцыю. У якiх бы абставiнах i ў якiм бы стане нi знаходзiўся чалавек, ён заўсёды iмкнецца да жыцця (*Тапелец i за саломку хапаецца; Калi топiшся, дык за брытву хопiшся*). Не зважаючы на блiзкую смерць, чалавек выказвае шмат памкненняў, задумак жыцця (*Памiраць збiрайся, а жыта сей; У прочкi выбiрайся, а жыта сей; Думкi за гарамi, а смерць за плячамi*). Парэмii даводзяць пра ўзаемасувязь жыцця i смерцi, пра заканамернасць смерцi i вечнага жыцця на тым свеце паводле жыцця на гэтым (*Хто ў жыццi спазнаў рай, той памрэ ў пекле; Пакуль жывеш – усяго трэба, а як памрэш – чатыры дошкi i зямлi трошкi*).

Такiм чынам, архетыповая апазiцыя *«жыццё – смерць»* як пачатак i канец жыцця чалавека на зямлi добра ўсвядомлена i выключна поўна, усебакова асветлена ў парэмiялагiчным фондзе беларускай мовы.

**Лiтаратура**

1 Архетип [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://slounik.org/153946.html. – Дата доступа: 1.04.2017 г.

***С. М. Аўдод***
*Навук. кiр.* ***В. С. Новак,***
*д-р фiлал. навук, прафесар*

## ТРАДЫЦЫI ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦI МАЁЙ МЯСЦОВАСЦI (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ ПЕТРЫКАЎСКАГА РАЁНА)

Вясельны абрадавы комплекс Петрыкаўшчыны, захоўваючы агульнаэтнiчную аснову, вылучаецца адметнымi лакальнымi асаблiвасцямi.

Паводле народных вераванняў, калi ў сям'i, напрыклад, было дзве дачкi, то спачатку павiнна была пайсцi замуж старэйшая. Як адзначыла жыхарка в. Грабнiкi, "калi хлопец прыйшоў сватаць яе сярэднюю сястру, то бацька прапанаваў узяць замуж старэйшую i хлопец згадзiўся" [1]. Са сватаннем як абрадавым этапам перадвясельнага перыяду былi звязаны прыкметы i павер'i адносна згоды або нязгоды на шлюб: калi нявеста была згодна на шлюб, то дарыла сватам ручнiкi i падарункi. Калi дзяўчына не хацела iсцi замуж, то яна "хату мяла ў бок дзвярэй". Тыя, хто iшоў у сваты, "абавязкова павiнны былi жыць у пары, непажадана было браць людзей удовых цi разведзеных, бо такi нешчаслiвы лёс мог напаткаць i маладую пару" [2].

У в. Грабнiкi садзiлi на дзяжу дзяўчыну, якая захавала цнатлiвасць. Паводле мясцовага павер'я, "першы, хто сядзе на дзяжу, калi нявеста ўжо ўставала, пойдзе наступным замуж" [2].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вясельны вянок, як правіла, плялі ў нашай мясцовасці як з жывых, так і са штучных кветак. Цікавай адметнасцю з'яўляўся той факт, што вянок вісеў у хаце да наступнага вяселля ў вёсцы і перадаваўся іншай нявесце ("…у нас вянок перадаваўся па ўсяму сялу" [2]).

На Петрыкаўшчыне пяклі два каравaі: адзін у хаце нявесты і адзін у хаце жаніха. Ад якасці выпечанага каравая залежаў лёс маладых, шчасце ў іх сямейным жыцці. Абрад дзяльбы каравая адбываўся і ў хаце маладой, і ў хаце маладога. "Кожны з гасцей спачатку выказваў свае пажаданні маладым, затым дарыў падарунак і толькі тады атрымліваў кавалак каравая. Віншаванне было часта жартоўнае" [3]. Рытуалы, якія адбываліся на розных абрадавых этапах вяселля, былі звязаны з засцярогай сямейнага дабрабыту, дзетанараджэннем.

### Спіс інфарматараў

1 Аксёнава Кацярына Кузьмінічна, 1944 г.н., в. Грабнікі Петрыкаўскага раёна.
2 Сігай Таццяна Міхайлаўна, 1949 г.н., в. Філіпавічы Петрыкаўскага раёна.
3 Коваль Марыя Несцераўна, 1937 г.н., в. Ванюжычы Петрыкаўскага раёна.

***Н. В. Барсукова***
*Нав. кір.* ***А. А. Станкевіч,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## ІНВЕРСІЯ ЯК СТЫЛІСТЫЧНЫ ПРЫЁМ У КАЛЫХАНКАХ

Калыханкі – адзін з першых жанраў дзіцячага фальклору, з якога пачынаецца знаёмства дзіцяці з навакольным светам і з фальклорам у цэлым. Інверсія адыгрывае вялікую ролю ў калыханках. Як стылістычны прыём яна садзейнічае прыцягненню і засяроджванню ўвагі слухача ці чытача, дапамагае найбольшай экспрэсівізацыі і рытмізацыі твораў.

**Інверсія** (лац. inversio 'перастаноўка') – парушэнне звычайнага парадку слоў у сказе з мэтай выдзялення асобных слоў і павышэння экспрэсіі выказвання [1, с. 148].

Існуе інверсія галоўных членаў (дзейніка і выказніка), якая найбольш пашырана ў творах як лірычных, так і эпічных, і інверсія даданых членаў сказа (дапаўнення, дапасаванага азначэння, акалічнасці). У калыханках пашырана інверсія выказніка і акалічнасці месца. Іверсія выказніка надае дзеянням у выказванні зменнасць, дынамічнасць, інтэнсіў-насць: *"Хадзіў каток па капусце, / Насіў сончык у белай хустцы"* [2, с. 68]; *"Ходзіць кот па сенажаці, / Кліча сон ён да дзіцяці"* [2, с. 68].

Інверсійны парадак акалічнасці месца садзейнічае сэнсаваму выдзяленню: *"Ай, баю! // Жывець Янка на краю"* [2, с. 181]; *"Люлі-люлі-люлі, / Сядзеў дзед у пуні, / А баба ў васеці / Калыхала дзеці"* [2, с. 183].

У калыханках інверсія выказніка даволі часта падмацоўваецца інверсіяй акалічнасці месца, якая выконвае ў творы рыфмаўтваральную функцыю: *"Баю-баю-баяньку, / Не кладзіся на крайку, / Прыбяжыць ваўчок / І знясець у лясок / Пад ракітавы кусток"* [2, с. 171]; *"Ой, люлі-люлі-люлі, / Жыў мужычок на краі* [2, с. 181].

Інверсія сустракаецца амаль ва ўсіх тэкстах калыханак. Пры адваротным парадку слоў пастаноўка членаў сказа ў нетыповае для іх становішча дапамагае засяродзіць на іх увагу актуалізаваць семантыку інверсаваных членаў сказа і надаць выказванням пэўную эмацыянальна-ацэначную і функцыянальна-стылістычную афарбоўку.

### Літаратура

1 Станкевіч, А. А. Рыторыка: падручнік / А. А. Станкевіч. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – 282 с.
2 Дзіцячы фальклор / рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка. – 1972. – 736 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ